3. *Довнар-Запольский, М.В.* Исследования и статьи / М.В. Довнар-Запольский. — Киев : Изд-во А.П. Сапунова, 1909. — 486 с.

4. *Ластоўскі, В.Ю.* Кароткая гісторыя Беларусі / В.Ю. Ластоўскі. — Мінск : Універсітэцкае, 1992. — 126 с.

5. *Ластоўскі, В.У.* Што трэба ведаць кожнаму беларусу / В.У. Ластоўскі // КулЛиб. — URL: https://coollib.com/b/260147-vatslaw-lastowski-shto-treba-vedats-kozhnamu-belarusu/read (дата звароту: 15.03.2025).

***В.А. Новік***

*Навуковы кіраўнік — кандыдат гістарычных навук В.М. Лянцэвіч*

*БДЭУ (Мінск)*

# ПРАВАВОЕ РЭГУЛЯВАННЕ ПАРАДКУ ЗАКЛЮЧЭННЯ ШЛЮБУ Ў ЗВЫЧАЁВЫМ, ЦАРКОЎНЫМ, ЗЕМСКІМ І ГАРАДСКІМ ПРАВЕ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА

У Вялікім Княстве Літоўскім (далей — ВКЛ) шлюб быў не толькі асабістай, але і сацыяльна-прававой з’явай. У маральна-этычным і рэлігійным кантэксце ён разглядаўся як саюз паміж мужчынам і жанчынай, скіраваны на стварэнне сям’і, выхаванне дзяцей і забеспячэнне маёмасных інтарэсаў роду. Як юрыдычнае пагадненне шлюб рэгуляваўся не адной, а некалькімі прававымі сістэмамі.

***Звычаёвае права.*** «Аповесць мінулых гадоў» (XII ст.) згадвае тры формы заключэня шлюбу ў славян-паганцаў: крадзеж «каля вады», вывядзенне паводле папярэдняй змовы, прывядзенне нявесты ў дом жаніха. Вясельны абрад уключаў падрыхтоўку, вянчанне і вяселле. Для сапраўднасці шлюбу выконваліся пэўныя звычаі: працэс *сватаўства* (сугляд) прадугледжваў знаёмства і агляд маладых і іх сваякоў. Ён пачынаў серыю запоін, якія маглі быць сціплымі (малыя запоіны) або шырокімі. Пасля малых запоін адмена шлюбу не мела юрыдычных наступстваў. Вялікія запоіны канчаткова ўзгаднялі дэталі вяселля.

*Змовіны* адбываліся ў доме нявесты, завяршаліся пісьмовым пагадненнем, падпісаным жаніхом і бацькам нявесты (або маці/братамі/апякуном, калі не было бацькі). У дакуменце фіксаваліся ўмовы шлюбу, памеры пасагу і вена, веравызнанне дзяцей (калі бакі розных канфесій). Парушэнне дамовы цягнула выплату кампенсацыі і вяртанне зарукі. Для юрыдычнай сілы патрабавалася падпісанне бакамі, сведкамі і ўнясенне ў актавыя кнігі судовых органаў [1, с. 101].

*Заручыны*, якія ўключалі абмен пярсцёнкамі, станавіліся апошнім абрадам падрыхтоўчага этапу. З прыняццем хрысціянства з’явіўся этап *вянчання*, які, аднак, не выключаў паганскія абрады (напрыклад, каравай хлеба ў царкве). Шматлікія рытуалы, якія суправаджалі ад’езд да царквы, мелі магічны характар і сімвалізавалі культ продкаў, урадлівасць і багацце [1, с. 102]. Наступным этапам было *вяселле* з традыцыйнымі элементамі: выпечка каравая, выкраданне нявес-

ты, гулянні, злучэнне маладых, расплятанне касы, надзяванне новага галаўнога убору, дзяльба каравая і пасцельны абрад. Завяршальным актам вяселля былі *пярэзвы* — апошняя сумесная размова, неабходная для згуртавання грамады.

***Царкоўнае права.*** Згодна з М. Суворавым, хрысціянская царква рэгламентавала шлюб праз заручыны, шлюбны кантракт, блаславенне ў храме і вянчанне [2, с. 19–20]. Для заключэння шлюбу патрабавалася згода жаніха, нявесты і іх родных. Перашкодай быў папярэдні шлюб. Усходняя (праваслаўная) царква вызначала шлюбны ўзрост: 15 гадоў для юнакоў, 12 — для дзяўчат (заходняя: 14 і 12 адпаведна). З сярэдзіны IX ст. пачаткам шлюбу лічыўся акт царкоўнага вянчання, узаконены заходняй і ўсходняй царквой, але абавязковым яно стала толькі ў сярэдзіне XVI ст. З азначэння шлюбу як духоўнай і рэлігійнай роднасці вынікала ўмова адзінства рэлігіі асобаў, якія ўступалі ў шлюб. Усходняя царква дазваляла злучацца ў шлюб з хрысціянінам іншага веравызнання пры ўмове прыняцця ім праваслаўя [1, с. 120]. У той жа час «Скрутак Яраслава», які меў распаўсюджанне ў ВКЛ да XVI–XVII стст., дазваляў шлюбы паміж праваслаўнымі і каталікамі. Забараняліся шлюбы з нехрысціянамі, раскольнікамі, евангелістамі, паганцамі. Калі пералічаныя ўмовы сапраўднасці шлюбу не былі выкананыя, ён ад самага пачатку прызнаваўся несапраўдным.

***Земскае права.*** Найважнейшай прычынай, па каторай рэгуляванне шлюбных адносін уваходзіла таксама ў кампетэнцыю свецкай улады, было права наследавання дочкамі шляхціцаў зямельных уладанняў, атрыманых за службу. Менавіта ў Ягайлавым агульназемскім прывілеі ад 22 лютага 1387 г. шлюбы паміж феадаламі-каталікамі і праваслаўнымі забараняліся.

У шлюбным праве Статутаў ВКЛ (1529, 1566, 1588) прасочваецца эвалюцыя ў вызначэнні шлюбнага ўзросту. У 1529 г. шлюб дазваляўся з 15 гадоў для дзяўчат і з 18 для юнакоў (р. I, арт. 18 ), у 1566 г. — з 15 гадоў для ўсіх (р. III, арт. 38), а ў 1588 г. — з 13 для дзяўчат і з 18 для юнакоў (р. VI, арт. 1).

Важнае значэнне мела норма, замацаваная ў трох рэдакцыях Статута, — свабода волевыяўлення на шлюб (р. III, арт. 31 Статута 1529 г.), каторая, з другога боку, падмацоўвалася неабходнасцю ўзгаднення з бацькамі альбо апекунамі (р. IV, арт. 11, 12; р. V, арт. 7, 8, 9, 31 Статута 1566 г.).

У Статуце 1588 г. ўпершыню ў свецкім заканадаўстве былі дэталёва прапісаны патрабаванні да шлюбу: шлюб не можа быць заключаны паміж людзьмі, звязанымі кроўным сваяцтвам да 4-га пакалення або сваяцтвам па мужу ці жонцы да 3-га пакалення (р. V, арт. 22). Акрамя таго, статутовае заканадаўства захоўвала прынцып манагаміі, забараняючы новы шлюб пры існаванні папярэдняга (р. V, арт. 22). Такім чынам, рэгулюючы шлюбныя адносіны, земскае права абапіралася на кананічнае права і перадавала рэгуляванне шлюбных дачыненняў царкоўнаму суду [1, с. 125].

***Гарадское права.*** Гарадскія сем'і існавалі на прафесійнай аснове. Цэхавыя правілы абмяжоўвалі шлюбы падмайстраў з дочкамі майстроў, але да іх імкнуліся з-за матэрыяльных выгод. Дабрабыт гарадской сям'і залежаў ад прафе-

сійных навыкаў яе членаў. Колькасць жанчын у горадзе пераважала над колькасцю мужчын. Для шлюбу існавалі матэрыяльныя абмежаванні: рамеснікі і рабочыя павінны былі пацвердзіць даход. Падмайстрам шлюб быў забаронены з-за адсутнасці ўласнага бізнесу і сродкаў [1, с. 37]. У гарадскім жыцці існавалі пэўныя шлюбныя звычаі:

● шлюбныя кантракты, якія афармляліся ў гарадскіх судах і рэгуляваліся гарадскім правам, дэталёва прапісвалі маёмасныя правы кожнага з бакоў, і былі больш распаўсюджанымі, чым у сельскай мясцовасці;

● гарадскія жыхары, як і сельскія, прытрымліваліся традыцыйных абрадаў і гулянняў, звязаных са шлюбам, каторыя мелі пэўныя адметнасці.

Даследаванне шлюбных адносін у ВКЛ дазваляе глыбей зразумець гістарычнае мінулае, культурныя асаблівасці і сацыяльную палітыку дзяржавы, а таксама падкрэслівае значнасць сям'і ў сярэднявечным грамадстве.

**Крыніцы**


1. *Дзербіна, Г.В.* Права і сям'я ў Беларусі эпохі Рэнесансу / Г.В. Дзербіна. — Мінск : Тэхналогія, 1997. — 175 с.

2. *Суворов, Н.С.* О гражданском браке / Н.С. Суворов. — Ярославль : Типо-литография Г. Фальк, 1887. — 91 с.



***А.М. Пасенюк***

*Научный руководитель — кандидат юридических наук Е.Н. Мазаник*

*БГЭУ (Минск)*


## ТОКЕНИЗАЦИЯ РЕАЛЬНЫХ АКТИВОВ (RWA): ОПЫТ ПРАВОВОГО РЕГУЛИРОВАНИЯ ШВЕЙЦАРИИ

В рамках инвестиционной деятельности технология блокчейн выступает инструментом токенизации системы, т.е. перевода права на реальные активы в цифровую плоскость. Рынок реальных активов, выпущенных в форме токенов на блокчейне, известен под названием RWA и включает недвижимость, право собственности, предметы искусства, драгоценности и металлы, традиционные финансовые инструменты и стейблкоины. Токенизация прав собственности на недвижимость создает гибкие условия для долевого владения. Кроме того, можно токенизировать строительные займы и вклады в инвестиционные фонды, специализирующиеся на недвижимости, предлагая более гибкий аналог жилищных облигаций.

По данным отчета Binance Research, на 2024 г. общий объем токенизации, выраженный в валютном соотношении, оценивается в 12 млрд долл. США [5, с. 5]. CoinMarketCap на 08.02.2025 г. оценивает рыночную капитализацию то-